# Даклад старшыні Рэдакцыйнай Камісіі З'езда таварыша Галадзеда М. М.

Таварышы, Рэдакцыйная Камісія, якая была абрана З'ездам Саветаў, працавала 18 лютага 1937 года і ўстанавіла канчатковы тэкст Канстытуцыі Беларускай ССР, які ўносіцца на канчатковае зацверджанне З'езда.

Рэдакцыйная Камісія ўнесла наступныя папраўкі ў тэкст Канстытуцыі:

У раздзеле II артыкул 14, у якім запісана, што Беларуская Савецкая Соцыялістычная Рэспубліка складаецца з акруг і раёнаў, Рэдакцыйная Камісія ў гэты артыкул ўнесла папраўку, каб раёны, якія ўваходзяць у склад акруг, таксама запісаць у Канстытуцыю. Таму ў рэдакцыі Рэдакцыйнай Камісіі З'езда гэты артыкул Канстытуцыі будзе чытацца так:

«Беларуская Савецкая Соцыялістычная Рэспубліка складаецца з акруг: Лепельскай у складзе раёнаў: Бягомельскага, Лепельскага, Ушацкага, Чашніцкага; Мазырскай у складзе раёнаў: Даманавіцкага, Ельскага, Жыткавіцкага, Капаткевіцкага, Лельчыцкага, Мазырскага, Нараўлянскага, Петрыкаўскага, Тураўскага; Полацкай у складзе раёнаў: Асвейскага, Ветрынскага, Дрысенскага, Полацкага, Расонскага; Слуцкай у складзе раёнаў: Грэскага, Копыльскага, Любаньскага, Слуцкага, Старобінскага, Чырвонаслабодскага; і з раёнаў: Аршанскага, Асіпавіцкага, Бабруйскага і т. д.» з пералічэннем усіх астатніх раёнаў.

Чым выкліканы гэтыя папраўкі Рэдакцыйнай Камісіі?

Яны выкліканы тым, каб пералічыць і запісаць у нашай Канстытуцыі ўсе раёны, у тым ліку і тыя, якія ўваходзяць у склад пералічаных акруг. Гэта па-першае.

Па-другое, гэтым самым канкрэтна абазначаецца размер акругі і з якіх раёнаў акруга складаецца, і, па-трэцяе, што ў гэтых раёнах таксама ўстанаўляецца больш стабільнае становішча ў сэнсе адміністрацыйнага падзелу.

Увесь сэнс гэтага артыкула Канстытуцыі заключаецца ў тым, што раз запісваюцца раёны і акругі ў нашу Канстытуцыю, то тым самым устанаўляецца ўстойлівасць у адміністрацыйным падзеле Рэспублікі, гэта значыць, будуць паменш краіць і перакрайваць граніцы раёнаў, акруг і сельскіх саветаў.

Вы памятаеце, што таварыш Сталін у сваім дакладзе таксама гаварыў, што нам трэба і ў справе раёнавання мець устойлівасць, стабільнасць. Гэта неабходна для гаспадарчага і палітычнага развіцця кожнага раёна, акругі, сельсовета.

Гэта—першая папраўка Рэдакцыйнай Камісіі.

Другая папраўка ў пункце «ж» артыкула 19-га. Гэтым артыкулам Канстытуцыі вызначаецца, чым ведае Беларуская ССР у асобе яе вышэйшых органаў улады і органаў дзяржаўнага кіравання.

Гэты пункт гаворыць, што БССР разам з іншымі задачамі ведае складаннем і выкананнем бюджэтаў рэспублікі, акруг і раёнаў. Рэдакцыйная Камісія дадала пасля слова «раёнаў»—«і гарадоў». Гэта значыць, што кіраванне складаннем і выкананнем бюджэтаў акруг і раёнаў таксама будзе распаўсюджвацца і на гарады. Патрэбнасць гэтай папраўкі зусім зразумела. Таму я не буду прыводзіць матывіроўкі.

У раздзеле 5 артыкул 54 Рэдакцыйная Камісія дадала слова: «пасёлка». І ў канчатковай рэдакцыі гэты артыкул будзе чытацца так: «Советы дэпутатаў працоўных (акругі, горада, раёна, сяла, мястэчка, пасёлка) кіруюць культурна-палітычным і гаспадарчым будаўніцтвам на сваёй тэрыторыі, устанаўляюць мясцовы бюджэт, кіруюць дзейнасцю падпарадкаваных ім органаў кіраўніцтва, забяспечваюць ахову дзяржаўнага парадку, садзейнічаюць узмацненню абароназдольнасці краіны, забяспечваюць выкананне законаў і ахову правоў грамадзян».

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы